# "ВЫТОКІ" КАХАННЯ ПАВОДЛЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ Г. КАРЖАНЕЎСКАЙ

***Рубанава В. А.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– Л. М. Мазуркевіч, канд. філал. навук, дацэнт*

Арыентуючыся на гендарныя адрозненні, трэба помніць і пра біяграфічныя дадзеныя паэтаў, а таксама пра сацыякультурную сітуацыю, у якой даводзілася жыць і працаваць чалавеку. "Жаночае" каханне ранжыруецца ў залежнасці ад мяркуемага месцазнаходжання "вытокаў" яго. Моўны матэрыял вершаў Г. Каржанеўскай дазваляе сведчыць "крыніцу" кахання па-за суб'ектам: *Я не адна, / не ў воблаках, – / дзе там! / Прыйдзе суседка – / раскажа пра дзетак. / Стрэну сяброўку – пачую таемны / Шэпт пра каханага – варты паэмы…* [2, с. 22]. "Крыніца" кахання можа знаходзіцца па-за воляй і намаганнямі чалавека, залежаць ад характару і тэмпераменту яго. Гэта абумоўлівае адносіны паэткі да кахання як да нечага прадвызначанага чалавеку лёсам, уласнымі паводзінамі, пасланага з нябёс як Божай міласці ці выпрабавання: *За мукі, за страты – любоў. / Прымі падарунак, не грэбуй, / Тым болей не скардзіся небу / На лютасць ягоных грамоў…* [2, с. 242]. Часта гэтая "крыніца" і погляды на каханне ўвогуле становяцца дыяметральна супрацьлеглымі адпаведна з узростам і набытай мудрасцю: *Абрала маё сэрца не таго, / каго б магло любіць без наракання…* [1, с. 50]. Паводле жаночых уяўленняў каханне – палон цела і душы, які прыносіць не толькі задаволенасць, спакой і ўпэўненасць у сваёй абранасці, але і неспакой, напружанасць, трывогу: *Я любіць пачынаю ўсур'ёз / Не пакуту, а рогат да слёз! / Ўсё шукаю (з далёкім табою), / Дзе мяжа чалавечага болю…*



МГПУ им. И.П.Шамякина

[2, с. 64]; *Безвыходнасцю свет замглёны: / Як жыць мне цяпер? / Як жыць? / Лёгка, лёгка быць улюбёнай, / Ды цяжка – любіць…* [2, с. 134]; *Жыццё, мяне не беражы / І надалей ад неспакою. / Не пакідай / на той мяжы, / Што між гарачаю любоўю / І між нянавісцю ляжыць…* [2, с. 65]. Трэба адзначыць, што меркаванні адносна вытокаў кахання традыцыйна падзяляюцца на тры групы: першая разглядае каханне як дадзенае чалавеку пачуццё, а значыць, яго "крыніца" знаходзіцца па-за межамі чалавечай дасягальнасці – чалавек не можа паўплываць на з'яўленне або страту кахання. Другая сцвярджае, што каханне чалавека заключаецца ў ім самім. Трэцяя сведчыць, што чалавек не здольны ўсвядоміць сваё каханне і прасачыць за часам яго з'яўлення ці страты.

**Літаратура**

1 Каржанеўская, Г. Жыла-была. Лірыка / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літаратура, 1983. – 95 с.

2 Каржанеўская, Г. Невымоўнае: вершы / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літаратура, 1991. – 287 с.



МГПУ им. И.П.Шамякина